УДК 821.161.3 У. Караткевіч

# МІФАЛАГІЧНЫЯ ВОБРАЗЫ І МАТЫВЫ Ў АПОВЕСЦІ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА “ЛАДДЗЯ РОСПАЧЫ”: АСАБЛІВАСЦІ ІНТЭРПРЭТАЦЫІ
# MYTHOLOGICAL IMAGES AND MOTIFS IN VLADIMIR KARATKEVICH'S NOVEL "THE BOAT OF DESPAIR": FEATURES OF INTERPRETATION

М. Г. Ясінская
M. H. Yasinskaya
БДПУ (Мінск)
Навук. кіраўн. – Н. В. Заяц, канд. філалаг. навук, дацэнт

Аналізуюцца міфалагічныя вобразы і матывы ў аповесці У. Караткевіча “Ладдзя Роспачы”. Паказваецца спецыфіка іх выкарыстання, вызначаецца мастацкая функцыя.

The mythological images and motifs in U. Karatkevich's novel "The Boat of the Despair" are analyzed. The specifics of their use are shown, the artistic function is determined.

Ключавыя словы: У. Караткевіч; міфалагічны вобраз; міфалагічны матыў.
Key words: U. Karatkevich; mythological image; mythological motif.

У літаратуры можна знайсці нямала прыкладаў творчага засваення набыткаў грэчаскай і рымскай міфалогій – старажытныя вобразы і матывы сталі традыцыйнымі для сусветнай літаратуры і культуры. У аповесці беларускага класіка У. Караткевіча “Ладдзя Роспачы” ўвасобіліся вобразы Арахны, Харона, Смерці і лемураў.

1. ***Арахна*** – у грэчаскай міфалогіі дачка Ідмона – фарбавальніка тканіны з Калафона. Была вядома як вышывальшчыца, чыім мастацтвам захапляліся німфы з ракі Пактола. Арахна вельмі ганарылася сваім майстэрствам і таму в*ы*клікала на спаборніцтва саму Афіну. Дачка Зеўса прыняла выклік ткачыхі, але спачатку прыйшла да яе ў выглядзе старой і папярэдзіла аб неабходнасці скарыцца перад багамі. Арахна не паслухала гэтай парады нават тады, калі багіня паўстала перад ёй у поўнай сваёй велічы.

Афіна выткала на пурпуным фоне выявы дванаццаці багоў, а па чатырох вуглах – пакаранні, якія атрымалі людзі пасля таго, як захацелі спаборнічаць з багамі. На сваім палатне майстрыца паказала любоўныя прыгоды Зеўса, Дыяніса і Пасейдона. Дзёрзкасць і непакора разгневалі багіню, яна парвала працу жанчыны і стукнула яе ткацкім чоўнам. Такой знявагі Арахна не сцярпела і павесілася, але Афіна дастала яе з пятлі і з дапамогай зелля Гекаты ператварыла ў павука, што заўсёды сядзіць на павуцінні і тчэ сваю пражу [1].

У “Ладдзі Роспачы” Арахна – гэта адна са служкаў Смерці, якая выпівае з людзей душу і памяць. Усю сцяну і дзверы ў царстве памерлых яна заткала павуціннем: “*Як чорныя блісучыя праменні, беглі ва ўсе бакі ніці таўшчынёй з руку. І, як пачварнае сонца, сядзеў у збегу гэтых праменняў кашлаты велічэзны павук са срэбраным крыжам на спіне – Арахна, якая тчэ павуцінне вечнасці*” [2, с. 155]. У галоўнага героя Гервасія Вылівахі наконт гэта стварэння ёсць свае меркаванні: ён кажа, што Арахну трэба было пакінуць “*для ўладароў, якія смокчуць кроў з народа і выступаюць за старыну*” [2, с. 156]. Калі ў міфе Арахна – гэта моцная, непахісная ў сваіх перакананнях жанчына, то ў творы У. Караткевіча павучыха паўстае звычайнай служкай, якая выконвае толькі тое, што скажа яе гаспадыня Смерць. Можна параўнаць яе з цівунамі, якія, згодна беларускаму фальклору, робяць усю марудную працу за свайго пана, у асноўным – караюць прыгонных, таксама ў пэўным сэнсе выпіваючы з людзей душу.

2. ***Лемуры*** – у старажытнарымскай міфалогіі духі людзей, якія памерлі гвалтоўнай смерцю і вярнуліся дзеля помсты. Людзі здаўна вераць у прывідаў. Так, рымляне думалі, што душы памерлых прадаўжаюць жыць за магільнай рысай. Калі духаў штосьці трывожыла (людзі былі забіты ці не атрымалі патрэбнага пахавання), то яны маглі пакінуць свае магілы і вярнуцца ў свет жывых, насылаючы на людзей вар'яцтва. Асабліва часта прывідамі станавіліся памерлыя ў выніку забойства і цяжкіх хвароб, а таксама пакараныя смерцю злачынцы [3].

Караткевічавы лемуры таксама, як і Арахна, служаць Смерці. Яны сустракаюць вязняў ладдзі Роспачы і запісваюць іх у рэестр. "*Белыя, бы з нежывога парцалану злепленыя людцы не людцы, а так, чорт ведае што, поскудзь з магутнымі мускуламі пад ліпучай скурай, нібы ў начных лемураў, вачыма, але затое з чарапамі, у якія наўрад ці ўлез бы напарстак мазгоў*" [2, с. 152]. Лемуры ў творы баяцца святла і песняў і ўцякаюць ад людзей. Але былі таксама іншыя лемуры: "*зусім без вачэй, з гладкай скурай на іх месцы*" [2, с. 153]. Галоўны сярод іх – "*сляпы з залатымі ключамі ля пояса, вялікі канцлер падземнага царства, высахлы стары, твар якога даўно нагадваў чэрап*" [2, с. 153]. Ад гэтых служак Смерці ўжо так проста было не адступіцца: сляпыя, яны не палохаліся святла і, здавалася, былі непераможнымі. Але калі чарга дайшла да Бярозкі і Вылівахі, Гервасій "*сарваў з грудзей зыркую, як жарынка, кветку шыпшыны і пачаў вадзіць ёю вакол сябе*" [2, с. 154], лемуры пачалі адыходзіць: па павер'ях, гэтая расліна магла адганяць злых духаў. У творы кветка шыпшыны таксама абазначае і жыццё, і родную зямлю. У. Караткевіч захоўвае галоўны казачны пастулат: жыццё заўсёды атрымлівае перамогу над смерцю.

3. ***Харон*** – сын бога цемры Эрэба і багіні ночы Нікты, перавозчык памерлых у замагільнае царства. У старажытнагрэчаскіх міфах апісваецца як стары ў бруднай адзежы, з доўгай і нячэсанай барадой. Яго пасажыры – гэта цені памерлых. Там, на зямлі, людзі ўжо справілі пахаванне. Але не ўсе душы маглі трапіць на човен Харона: тых, каго родныя не пахавалі, стары адштурхоўваў і прымушаў бадзяцца, так і не знайшоўшы супакой. Перавозка мела сваю цану: для таго, каб Харон прыняў цень на свой човен, старажытныя грэкі клалі ў рот памерламу дробную манету. Толькі некалькім, да таго ж яшчэ і жывым гасцям царства Аіда, удалося пазбегнуць аплаты. Перавозчык не ўзяў грошай з Геракла, бо спужаўся яго злоснага погляду, і з Арфея, бо быў уражаны яго музыкай і спевамі [5].

Сітуацыю з Гераклам можна параўнаць з учынкам Гервасія. Выліваха, каб уратаваць хлопца, бедныя бацькі якога не змаглі пакласці сыну манетку, узняў бунт на ладдзі Роспачы. Перавозчыку таксама нічога не засталося, як змірыцца з гэтым і не браць грошай.

У аповесці Харон завецца Шолахам. Ён таксама служка Смерці, але, па У. Караткевічу, некалі быў чалавекам і жыў на Полаччыне. Шолах рос разам з сынамі і дачкою Рагвалода Рагнедай, якую моцна кахаў, але пайшоў на здраду і "*прадаў Полацк кіеўскаму князю Уладзіміру*" [2, с. 148]. З тых пор ва ўсіх пакутах роднага горада ён вінаваціць сябе. Шолах спрабаваў усё забыць, але, калі Гервасій разам з іншымі вязнямі ладдзі Роспачы пачаў спяваць, не вытрымаў і расказаў сваю сумную гісторыю. Выліваха бачыў, "*што з-пад плесні на вачніцах Перавозчыка пакаціліся раптам слёзы. Яны, відаць, былі вельмі пякучыя, бо спалілі і знішчылі плесню. І з-пад яе з'явіліся раптам вочы, спалоханыя жудаснай веліччу гэтага ржвага мора.*

*Сінія*" [2, с. 148].

Спачаку Шолах паводзіў сябе як сапраўдны цівун, рабіў тое, што яму казалі, бо вельмі моцна баяўся сваёй гаспадыні, але пасля сустрэчы з рагачоўцам у ім нешта змянілася. Можна сказаць, што ён пайшоў супраць сваёй пані – і ў прамым, і ў

пераносным сэнсе ў яго расплюшчыліся вочы. Пасля шахматнай перамогі Вылівахі над Смерцю ў Шолаха з'явіліся дадатковыя дваццаць гадоў жыцця, якія ён аддаў рагачоўцу і Бярозцы. Яны былі непатрэбныя Перавозчыку, бо на самой справе ён прагнуў толькі аднаго – забыцця. "*Увесь абмяклы, увесь грузлы, ён ішоў… ішоў… ішоў і спыніўся толькі каля павуціння. Павярнўся. Абвёў людзей сінімі вачыма… Ён прагна, са стогнам пацягнуў рукі. Арахна кінулася ўніз і схапіла яго. У наступнае імгненне ён знік. Знік, быццам яго і не было. Пачуўся яшчэ толькі шолах, нібы вызвалены ўздых*" [2, с. 166].

4. ***Смерць***. Гэты вобраз не належыць да антычнай міфалогіі, аднак ставіцца У. Караткевічам побач з грэчаскімі персанажамі. Пачынаючы са спрадвечных часоў вобраз Смерці сустракаецца ў міфах і легендах усіх сусветных культур. Чалавек не мог растлумачыць прычыну смерці і ўяўляў Смерць як нешта жывое. У еўрапейскай культуры яе часта малявалі ў выглядзе шкілета з касой, апранутага ў белы альбо чорны балахон з капюшонам (англ. – Grim Reaper – "змрочны жнец") [4].

У Караткевіча Смерць – гэта немаладая жанчына, вышэй за якую не было нікога на зямлі. У творы яна прыходзіць да Гервасія Вылівахі ў яго "*самы салодкі час*". "*Прыцягнулася па звілістай сцежцы, цяжка перастаўляючы ногі, якія дрэнна згіналіся, захінуўшы на тулаве чорны плашч, нібы ёй было холадна, і ўсміхаючыся вечнай і нязменнай ўсмешкай, ад якой кідала ў жудасць*" [2, с. 138]. Каралева падземнага царства не любіць прыходзіць па такіх, як Гервасій, бо яны "*прагныя да жыцця*" і "*так любяць гэтую зямлю*", што яна ў сваіх пячорах пачынае "*на хвіліну зайздросціць ім*" [2, с. 139].

Смерць спраўна выконвае свае абавязкі. І ўсё было добра, пакуль ў яе царства не трапіў Выліваха. З яго паводзін, з таго, як ён трымаецца, зразумела, што гэта чалавек з моцным характарам. "Бязвокая" спрабуе зламаць яго, але безвынікова.

Смерць – упэўненая ў сабе жанчына. Спаборніцтва з Гервасіем у шахматы яна ўспрымае як гульню. Калі рагачовец прайграе першы раз, дае яму другі шанец, бо перакананa ў сваёй неперамажнасці. Галоўнай рысай Бязвокай з'яўляецца спакой, але праз Гервасія яна яго страчвае. Мабыць так, як Выліваха, не паводзіў сябе ні адзін чалавек, які трапляў у яе царства. Калі кашчавая выходзіць з раўнавагі, то чытачу становіцца зразумела, што на самой справе Смерць – гэта жанчына з няпростым лёсам: калісьці даўно ёй здрадзіў каханы чалавек. Хутчэй за ўсё, менавіта з тых пор яна і стала такой, уладарнай прыгнятальніцай. Тым не менш гэта не апраўдвае Бязвокую, бо надта ўжо яна ўжылася ў гэты вобраз.

У творы У. Караткевіча сцвярджаецца права чалавека на свабоду: ніхто не мае права здзекавацца з людзей, вымяшчаць злосць на іншых. Таму відавочна, што Гервасій перамагае ў шахматах. Сваёй кемлівасцю і жыццялюбствам ён перахітрыў саму Смерць. Гэта перамога Дабра над Злом, Жыцця над Смерцю.

Майстэрскае спалучэнне набыткаў антычнай міфалогіі з гісторыяй нашага краю ў аповесці "Ладдзя Роспачы" дазволіла У. Караткевічу па-новаму раскрыць традыцыйны матыў супрацьстаяння Жыцця са Смерцю, выказаць ідэю пра неперамажнасць беларуса.

*Літаратура*

1. Арахна [Электронный ресурс] // Энциклопедия мифологии. – Режим доступа: http://godsbay.ru/hellas/arahna.html. – Дата доступа: 24.12.19.
2. Караткевіч, У. Збор твораў : у 8 т. – Мінск : Маст. літ., 1987–1990. – Т. 2 : Аповесці, апавяданні, казкі. – 1988. – 511 с.

3. Лемуры [Электронный ресурс] // BESTIARY.US : энциклопедия вымышленных существ. – Режим доступа: https://www.bestiary.us/lemury. – Дата доступа: 24.12.19.
4. Образ смерти [Электронный ресурс] // Википедия : свободная энциклопедия. – Режим доступа: https://ru.wikipedia.org/wiki/%D0%9E%D0%B1%D1%80%D0%B0%D0%B7_%D1%81%D0%BC%D0%B5%D1%80%D1%82%D0%B8. – Дата доступа: 24.12.19.
5. Харон – перевозчик душ [Электронный ресурс] // Styx.by. – Режим доступа: https://styx.by/. – Дата доступа: 24.12.19.